# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

28 САКАВІКА 1996 года чацвер

№6 (1742)




*Віншуем!*

Сваё 75-годдзе адсвяткавала 18 сакавіка **Вольга Філіпаўна Якушка** — заснавальніца беларускай лімналагічнай школы, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, першая жанчына-доктар геаграфічных навук у Беларусі, прафесар кафедры агульнага землязнаўства.

За трыццацігадовы перыяд даследаванняў вадаёмаў яна сфармавала беларускую лімналагічную школу, адну з найбольш вядомых у СНД і за яе межамі. Прафесар В.Ф.Якушка з'яўляецца ініцыятарам стварэння ў Беларусі многіх азёрных, гідралагічных і ландшафтных заказнікаў.

Вольга Філіпаўна — аўтар больш чым 300 навуковых і навукова-папулярных прац. Ёй належыць аўтарства школьных, універсітэцкіх падручнікаў, шматлікіх навукова-папулярных публікацый, у якіх яна выявіла сябе актыўным папулярызатарам навуковых ведаў і ініцыятарам аховы прыроды ў Рэспубліцы Беларусь.

У сувязі з юбілеем В.Ф.Якушка і за заслугі ў галіне аховы прыроды дэканат геаграфічнага факультэта і кафедра агульнага землязнаўства выступілі з хадайніцтвам перад Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь аб узнагароджанні яе Ганаровай граматай Міністэрства.

*Постфактум*

***20 сакавіка на гістарычным факультэце адбылася сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь спадаром Чжао Сідзі, якога суправаджалі два супрацоўнікі пасольства і супрацоўнік Міністэрства замежных спраў В.М.Мацаль.***

***Сустрэчу адкрыў дэкан факультэта міжнародных зносін А.В.Шарапа. У дакладзе спадара пасла "Некаторыя моманты знешняй палітыкі Кітая на сучасным этапе" гаварылася аб падзеях вакол Тайваня і аб поглядзе ўрада КНР на гэтыя праблемы, аб праблеме правоў чалавека, аб уяўнай пагрозе з боку Кітая краінам рэгіёна, аб чым шмат пішуць на Захадзе. "Мы будуем сацыялізм і надалей будзем яго будаваць — у нас асаблівы шлях развіцця,"— адзначыў спадар Чжао Сідзі.***

***Напрыканцы сустрэчы, пасля таго, як пасол адказаў на пытанні, Аляксандр Віктаравіч Шарапа сардэчна падзякаваў госцю.***

*Па выніках зімовай сесіі*

## Пяты курс — першы. Па паспяховасці

Падведзены вынікі зімовай сесіі. У працэнтах дадзена абсалютная паспяховасць (суадносіны колькасці студэнтаў, якія здалі сесію, да колькасці студэнтаў, якія павінны былі здаваць):

факультэт журналістыкі — 87,5%;
філалагічны факультэт — 84%;
філасофска-эканамічны факультэт — 95,4%;
гістарычны факультэт — 80,6%;
факультэт міжнародных адносін — 88,9%;
юрыдычны факультэт — 93,9%;
фізічны факультэт — 86,6%;
хімічны факультэт — 81,8%;
механіка-матэматычны факультэт — 81,2%;
факультэт радыёфізікі і электронікі — 79,2%;
факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 87,4%;
біялагічны факультэт — 90,2%;
геаграфічны факультэт — 71,5%;
увогуле па універсітэту — 85,2%.

Па курсах паказчык паспяховасці выглядае наступным чынам:

I курс — 81,2%;
II курс — 85,7%;
III курс — 83,3%;
IV курс — 83%;
V курс — 94,3%.

• • •

*Абітурыент-96*

## Заплаці — і вучыся!

У гэтым годзе ва універсітэце на платным аддзяленні навучаецца 1386 студэнтаў (без уліку студэнтаў юрыдычнага факультэта, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю). З іх 936 — на дзённай форме навучання, 447 — на завочнай, 3 — на вячэрняй.

Большая колькасць студэнтаў, якія атрымліваюць платную адукацыю, вучыцца на юрыдычным (377), філасофска-эканамічным (268) факультэце, факультэце журналістыкі (142) і факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (119).

У 1995/96 навучальным годзе на першы курс універсітэта было залічана 667 "платнікаў" (з іх 447 — на дзённае навучанне).

## Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі

**аб'яўляе конкурс**

на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу кафедраў:

загадчыка кафедры гісторыі і беларусазнаўства (доктар навук, прафесар);

загадчыка кафедры філасофіі і культуралогіі;

дацэнтаў кафедраў філасофіі і культуралогіі (2), гісторыі і беларусазнаўства (1).

Тэрмін падачы дакументаў — **адзін месяц** з дня апублікавання аб'явы. Дакументы накіроўваць на адрас: ***220001, г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў. Тэл. 22-83-15.***

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" **28 сакавіка 1996 года.**



**У кітайскай групе — заняткі па рускай мове. Вядзе старшы выкладчык Раіса Паўлаўна Навумчык**

*Хутка — 1 красавіка!*

*21-23 сакавіка праходзіў Першы рэспубліканскі фестываль студэнцкіх тэатраў эстрадных мініяцюр "СТЭМ' 96". Свята студэнцкага гумару адбывалася ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце.*

*З нагоды Сусветнага свята гумару чытайце на 4-ай паласе "Беларускага універсітэта" нашу традыцыйную рубрыку "Афіцыйна".*



**Лепшыя слухачы падрытоўчага аддзялення з намеснікам дэкана Святланай Сяргееўнай Акунскай і загадчыкам кафедры рускай мовы Уладзімірам Нікіфаравічам Радыёнавым**

*І жартам, і ўсур'ёз*

# Студэнт Яе Вялікасці: учора, сёння і заўтра

### Пралог

Пачынаючы размову аб студэнтах, нельга не сказаць, што гэта — самая галодная, цікавая і інтэлектуальна-пазнаваўчая частка насельніцтва. Можна сказаць, што гэта асаблівая праслойка грамадства, якая заслугоўвае самай пільнай увагі. Ахвотныя могуць нават абараніць дысертацыю па гэтаму пытанню. Такім чынам, пачнем-с...



### Частка І. Як усё пачыналася

Аказваецца, гісторыя гэтая вельмі даўняя. Расійскія студэнты зарадзіліся яшчэ ў 1755 годзе, калі 12 студзеня Лізаветай быў падпісаны указ аб заснаванні першага рускага універсітэта. У гэты дзень спраўляла імяніны Таццяна — маці фаварыта Лізаветы графа Шувалава, таму ў Расіі гэты дзень і сталі называць "Таццяніным днём". На арэну жыцця выйшаў чалавек з тытулам "Студэнт Яе Вялікасці".

А вось як пісьменнік Міхаіл Чулкоў адрэагаваў на гэтую падзею: "Смею основательно заверить тебя, мой любезный читатель, что ещё не уродилось такой твари на белом свете, которая была б отважнее российского студента!"

Дык вось, гэтае стварэнне аказалася настолькі жывучым, што змагло працягнуць свой род, пакідаючы шматлікіх нашчадкаў. Прычым нашыя, беларускія студэнты не былі дамарosла-вучанымі, ездзілі па веды ў Пецярбург і Маскву. Свае педагагічныя інстытуты з'явіліся ў нас толькі ў пачатку XX стагоддзя.

### Частка ІІ. Канец XX стагоддзя

Праходзячы натуральны адбор праз здачу экзаменацыйнай сесіі, студэнцтва дасягнула значнага поспеху з XVIII стагоддзя ў інтэлектуальным развіцці. Хаця нашага студэнта Студэнтам Яе Вялікасці ніяк не назавеш!

Але ўсё ж яны працягваюць жыць, прычым жывуць неяк асабліва ўзбударажана-весела, хаця і ў агідных умовах, але з нязменнай усмешкай на вуснах. Гэткае вялікае "общее-житие", сімбіёз (як гэта называецца ў біёлагаў). Прычым студэнты, якія навучаюцца па месцы жыхарства, ніколі да канца так і не стануць сваімі, чыстакроўнымі. "Чыстапародны" студэнт — гэта чалавек, які прайшоў праз гэтыя інтэрнацкія "агонь-ваду-і-медныя-трубы", пастаянна даказваючы, што ён стварэнне жывучае, вартае сваіх слаўных продкаў. Менавіта пра іх і пойдзе далейшая гаворка.

### Частка ІІІ. Лекцыі

Тут усе студэнты падраздзяляюцца на некалькі групаў: самая вялікая — група тых, хто спрабуе слухаць, крыху менш — тых, хто пачуў, 20% — тых, хто запісвае, і працэнты 3 складаюць тыя, хто зразумеў, што было запісана.

Яскрава вымалёўваецца самотная фігура выкладчыка — асіплага чалавека ў акулярах, невысокага росту, якія мае маленькіх дзяцей альбо ўнукаў і атрымлівае крайне мале-енькі заробак, ад чаго ад пастаянных скаргаў на нэдахоп грошай у студэнтаў з'яўляецца жаданне "отстегнуть" (ах, гэтае шыкоўнае слова!) ад стыпендыі і "скінуцца" ўсім выкладчыкам па трошку. Хаця нельга не заўважыць парадаксальную сітуацыю: студэнты баяцца, але ў той жа час шкадуюць сваіх "преподов" і ні ў якім выпадку не хочуць апынуцца ў іх становішчы.

Тут жа, на лекцыі, нязменна выконваюцца некалькі запаветаў студэнта:

***Не спазняйся, бо тут цябе ўсё адно ніхто не чакае.***

***Не забі гэтую муху, бо не будзе каму цябе забаўляць.***

***Не захрапі, бо пабудзіш таго, хто спіць побач.***

***Не ствары сабе куміра з выкладчыка, бо на экзамене гэта цябе ўсё адно не выратуе.***

***Не ўкрадзі чужы канспект, бо ў ім усё адно нічога няма.***

***Не пакутуй ад суму, бо ты можаш дамаляваць да даўжэзнага эшалона на парце вагончык і гэтым самым выявіць сваю безвыходную самоту.***




Трэба заўважыць такую заканамернасць: чым бліжэй вясна, тым менш студэнтаў з'яўляецца на лекцыях. А ўвесь фокус у тым, што ад пастаяннага холаду некаторыя проста прымярзаюць да крэслаў, і тут ужо воляй-няволяй даводзіцца даседжваць да самага канца... зімы. Але вясной прыходзіць цяпло, наступае адліга, і наш герой-студэнт заўважна ажыўляецца, адтайвае, падбадзёрваецца і... уцякае піць піва.

### Частка IV. Інтэрнат як месца пражывання

Наогул, гэтае месца часовага пражывання разлічанае менавіта на тое, каб студэнт, які можа сабе гэта дазволіць, у ім не жыў. Таму тут арганізуюцца і прадпрымаюцца ўсялякія спробы неяк паўплываць на жыццё студэнта. Такія спробы нязменна скончваюцца правалам, усе ведаюць, што гэтыя задумы загадзя асуджаныя: пастаянныя праверкі, дзяжурствы, куча абавязкаў. Ну, каму ўсё гэта патрэбна? Затое, каб праверыць кожнага на выжывальнасць, у інтэрнатах ствараюцца экстрэмальныя ўмовы: Вас селяць на 12-ы паверх, а ліфт па выхадных адключаецца (і не думайце, што хто-небудзь пагледзіць, што Вы цягнеце вялізную сумку з дому, і ўключыць яго). Вясной ці летам нязменна адключаецца вада, Вас раз на два тыдні хто-небудзь правярае: пажарнікі (якім няма ніякай справы да электрычнасці, яны чамусьці глядзяць за Вашай маральнасцю і ахайнасцю, хаця загадзя цвёрда перакананыя, што гэтыя якасці адсутнічаюць у Вас начыста), оператрад (які імкнецца знайсці ў Вас і забраць лішні матрац ці сетку з ложка і адначасова падсяліць да Вас кагосьці яшчэ), яшчэ нейкія людзі, якія правяраюць наяўнасць абагравальных прыбораў і электрычных плітак (хаця загадзя ведаюць, што нічога не знойдуць, бо гэтыя самыя пліткі маскіруюцца, "хамелеанізуюцца" пад абстаноўку пакоя) . яшчэ шмат іншых правяральнікаў, міліцыя, у час выбараў — куча агітатараў, прычым пастаянна ад партыі БНФ. Таму нават пры адсутнасці тэлевізара і радыё сумаваць Вам усё адно не дадуць.

Хаця калі паглядзець на ўсё гэта з іншага боку, то ўсё не так ужо страшна. Чалавек прызвычайваецца да ўсяго. Нават да таго нягласнага распарадку, які царуе ў інтэрнаце: кладзешся не раней за 12, падымаешся не пазней, чым у 7; ведаеш пра суседзяў літаральна ўсё (хто да іх прыходзіць у госці, што яны ядуць і якой пастай чысцяць зубы), хаця пры гэтым не лічышся цікаўным чалавекам; уначы чуеш музыку з ніжніх паверхаў, а зранку — дзікія крыкі з верхніх. Плачаш і смяешся, вучышся і лайдачыш, некага любіш, а некага ненавідзіш — увогуле, жывеш.

### Эпілог

Студэнты жылі, жывуць і, відавочна, будуць жыць яшчэ доўга-доўга...

Неяк на парце я прачытала такі надпіс: "Усе мы зараз шчаслівыя. Толькі мы зразумеем гэта гадоў праз 30". Хіба не так? І якім стане "Студэнт Яе Вялікасці" праз 30 гадоў? Адно пэўна: ён не будзе падобны да нас, гэта будзе новы чалавек — студэнт XXI стагоддзя.

**Раіса Мшар,**
**студэнтка факультэта журналістыкі**



*Тэлефон 02*

## Засцерагацца ад злачынства

У горадзе Мінску здзяйсняецца значная колькасць крадзяжоў, абрабаванняў, вымагальніцтваў і іншых злачынстваў. Прадметамі злачынных замахаў з'яўляюцца грашовыя сродкі, відэа- і радыёапаратура, камп'ютэры, залатыя і ювелірныя вырабы, іншыя каштоўнасці.

Так, 9 сакавіка гэтага года быў затрыманы грамадзянін Грынчык А.Р., студэнт першага курса БДУ, які пранік у памяшканне склада "Мінскаўтатэхтранс" і выкраў адтуль пакунак з асвятляльнымі лямпачкамі, а таксама 16 вентыляў з каляровых металаў. Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Аддзяленне прафілактыкі Маскоўскага РАУС г.Мінска ў інтарэсах Вашай абароны і папярэджання злачынстваў настойліва рэкамендуе:

не уступаць у здзелкі маёмаснага характару з грамадзянамі, асоба і дзейнасць якіх Вам не вядомыя, не запрашаць такіх асобаў на дзелавыя сустрэчы і ў госці;

не абвяшчаць у коле сяброў і знаёмых звесткі аб кааператыўных і асабістых даходах, наяўнасці ў карыстанні каштоўнасцяў і дарагой маёмасці;

не прымаць на працу асобаў, якія былі асуджаныя, якія парушаюць грамадскі парадак і працоўную дысцыпліну, якія злоўжываюць спіртнымі напіткамі;

правяраць праз АУС асобаў, якіх прымаюць на матэрыяльна-адказныя пасады;

абсталяваць памяшканні кааператываў ахоўнай сігналізацыя, надзейнымі замкамі, сігналам трывогі, якія можна ўключыць незаўважна пры рэальным нападзе;

захоўваць грошы і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці ў дзяржбанках, металічных сейфах, заблакіраваных ахоўнай сігналізацыяй.

У выпадку крадзяжоў, вымагальніцтваў, пагрозаў нападу і г.д. неадкладна паведаміце па тэлефону 02 ці ў Маскоўскі РАУС па тэлефонах 56-07-52, 56-78-15.

***Інспектар прафілактыкі Маскоўскага РАУС г.Мінска лейтэнант міліцыі Мацко С.М.***

# Гісторыя пра гісторыю

***Вядома, што ад вялікага да смешнага — толькі адзін крок. Пэўна, ніхто не стане сумнявацца ў гэтым і спрачацца. І вядома ўсім таксама, што сатыра — самы лепшы, самы высакародны сродак выпраўлення грамадскіх нораваў. Сёння, калі вось-вось амаль наступіла першае красавіка, на якое прынята жартаваць і разыгрываць адзін аднаго, мы пагаворым з вамі аб сур'ёзным — аб сатыры. Бо, пагадзіцеся, гэта вельмі-вельмі сур'ёзна.***

***Ведалі пра гэта і любімыя многімі пісьменнікі Тэфі, Восіп Дымаў, О.Лу'Ор (Оршэр), М.В.Рэмізаў-Васільеў (Рэ-Мі). У 1908 годзе яны аб'ядналіся вакол часопіса "Сатырыкон", які вырас з гумарыстычнага штотыднёвіка "Страказа". Дзейнасць "Сатырыкона" была бясконца разнастайнай і плённай. Мусіць, не засталося ніводнага боку грамадскага і культурнага жыцця, у які "сатырыконцы" не нацэлілі б сваё вострае пяро. Але пад самай пільнай увагай іх аказалася сістэма адукацыі, паколькі ўсе яны прайшлі праз гімназію з яе сістэмай зуброжкі. Асабліва ад "сатырыконцаў" дасталося "гісторыі". Праўда, сама гісторыя ад гэтага ніколечкі не пацярпела, а вось падручнік па гісторыі Дзмітрыя Іванавіча Ілавайскага стаў аб'ектам паражэння для буйнакаліберных парадыйных сіл "сатырыконцаў". Асноўную ўвагу Ілавайскі надаваў дзейнасці шматлікіх цароў і палкаводцаў. (Падручнік гэты быў працай сур'ёзнага навукоўца, але адно толькі пералічэнне імёнаў цароў і палкаводцаў, прыклады вялікіх дзеянняў гістарычных персанажаў, якія з'яўляліся на сцэне гісторыі нібыта толькі для таго, каб выканаць які-небудзь "слаўны" ўчынак, наводзіла сум на гімназічныя душы.) Так у "сатырыконцаў" нарадзілася ідэя стварыць пародыю на афіцыёзныя падручнікі па гісторыі для гімназіі.***

***Трошку, зусім крыху прывядзем мы прыкладаў з гэтага цудоўнага падручніка. А вы, будучыя гісторыкі, ці будучыя філосафы, ці проста вельмі сур'ёзныя людзі, пастарайцеся адшукаць гэты падручнік. Ну, вельмі карыснае чытанне!!!***

гісторыі

**Егіпет.** Аб загадкавых пірамідах: піраміды ёсць будынкі пірамідальнай формы, якія ўзводзіліся фараонамі дзеля свайго ўслаўлення. Фараоны былі людзі клапатлівыя і не давяралі нават самым блізкім людзям распараджацца сваім трупам на іх меркаванне. І, толькі выйшаўшы з немаўлячага ўзросту, фараон ужо прыглядваў сабе ўтульнае месцейка і пачынаў будаваць піраміду для свайго будучага праху.

**Аб Дарыі Гістаспе і скіфах.** Скіфы былі вельмі храбрымі і жорсткімі. Пасля бітвы наладжвалі піраванні, у час якіх пілі і елі з чарапоў свежазабітых ворагаў. Тыя з воінаў, якія не забілі ніводнага ворага, не маглі прымаць удзел у піраванні, бо не мелі свайго посуду, іназіралі здалёк за ўрачыстасцю ў пакутах голаду і згрызотах сумлення. Даведаўшыся аб набліжэнні Дарыя Гістаспа, скіфы паслалі яму жабку, птушку, мыш і стралу. Гэтымі немудрагелістымі дарункамі яны думалі змякчыць сэрца грознага ворага. Але справа павярнулася зусім іначай.

Адзін з воінаў Дарыя Гістаспа, якому вельмі надакучыла швэндацца за сваім валадаром па чужых землях, узяўся патлумачыць сапраўднае значэнне скіфскай пасылкі:

— Гэта значыць, што калі вы, персы, не будзеце лятаць, як птушкі, грызці, як мышы, і скакаць, як жабкі, то не вернецеся да сябе дадому ніколі.

Дарый не ўмеў ні лятаць, ні скакаць. Ён перапалохаўся і загадаў паварочваць аглоблі.

**Аб народанасельніцтве ў Грэцыі:** апрача цара, воінаў і народу, былі ў Грэцыі яшчэ і рабы, якіх складалі былыя цары, былыя воіны і былы народ.

**Аб імператары Нероне:** ён пеў настолькі фальшыва, што самыя фальшывыя душы з прыдворных не маглі часам вытрываць гэтай знявагі барабаннай перапонкі. Бессаромны казлятон пад канец жыцця задумаў паехаць на гастролі ў Грэцыю, але тут абурыліся нават звыклыя да ўсяго легіёны, і Нерон з вялікім незадавальненнем пранзіў сябе мечам. Гінучы ад адсутнасці самакрытыкі, тыран усклікнуў: "Які вялікі артыст гіне!"

**Аб побыце рымлянаў:** харч рымлянаў вылучаўся прастатою. Елі яны два разы ў дзень: апоўдні закуска (prandium), а ў чатыры гадзіны абед (coena). Апрача таго, зранку яны снедалі, увечары вячэралі і паміж ежай марылі чарвячка. Гэты суровы лад жыцця рабіў з рымлянаў здаровых і даўгавечных людзей.

**Аб рэлігійных перакананнях рымлянаў:** жрыцамі багіні Весты былі весталкі. Выбіраліся яны з дзяўчат добрай фаміліі і служылі пры храме, захоўваючы цноту да 75 гадоў. Пасля гэтага тэрміну ім дазвалялася выходзіць замуж.

**Аб славутым Атыле,** кіраўніку гунаў, які імкнуўся зрабіцца магутнейшым заваёўнікам і таму вымушаны быў сачыняць афарызмы, таму што такі быў парадак: Атыла быў пахаваны ў трох трунах у пустынным месцы. Каб ніхто не ведаў, дзе знаходзіцца яго магіла, людзі, якія капалі яе, былі забітыя. Потым забілі тых, хто забіў людзей, якія капалі магілу. Потым — забойцу гэтых забойцаў, далей — забойцу забойцы гэтых забойцаў... Працягваючы гэтую сістэму, гуны вельмі хутка знішчылі б сябе, але нецярплівыя германскія і заходнеславянскія народы, не дачакаўшыся канца гэтай, у любым выпадку, дасціпнай камбінацыі, паўсталі і зрынулі валадарства гунаў. Такім чынам ім удалося адцягнуць увагу гунаў ад магілы любімага правадыра.

**Аб часах Каралінгаў:** для таго, каб зразумець, якім чынам Карл Вялікі дзякуючы папе Льву III пераўтварыўся з караля ў імператара, неабходна папярэдне расказаць невялікі, але павучальны анекдот.

Гулялі два прыяцелі і сустрэлі маладую дзяўчыну.

— Яна вельмі прыгожая,— сказаў першы.— Добра б з ёй пазнаёміцца. Ты яе ведаеш?

— Не,— адказаў другі,— але гэта нічога не значыць.

Ён падышоў да дзяўчыны і, ветліва прыўзняўшы капялюш, сказаў:

— Спадарыня, дазвольце прадставіць Вам майго найлепшага сябра, пана N.

Дзяўчына здзіўлена паглядзела на яго:

— Але я Вас зусім не ведаю,— адказала яна.

— А вось пан N цяпер мяне пазнаёміць. Прадстаў мяне,— звярнуўся ён да сябра. І яны працягвалі шпацыр ужо ўтрох.

Тое ж адбылося з Карлам і Львом III.

— Вы абвесціце мяне імператарам і ўскладзяце на маю галаву залатую карону,— сказаў Карл Льву III.

— З задавальненнем,— адказаў папа,— але мяне самога хочуць зрынуць з папскага прастолу.

— Гэта нічога не значыць. Я як імператар падтрымаю Вас.

І сапраўды, Карл зацвердзіў Льва, а Леў зацвердзіў Карла. І свой шпацыр па старонках гісторыі яны працягвалі ўжо ўтрох: папа, імператар і карона.

## Новая гісторыя

**Аб вынаходніцтве кнігадрукарскага станка Іяганам Гутэнбергам.** У часы Гутэнберга друкавалі кнігі так: на драўлянай дошцы выразалі пукатыя літары, намазвалі чорнай фарбай і, паклаўшы на паперу дошку, сядалі на яе ў ролі рухомага, энергічнага прэса. Ад цяжару тыпографа залежыла чысціня і выразнасць друку.

**Аб асобе Марціна Лютэра:** як і большасць людзей яго сорту, Марцін Лютэр меў запалыя палымяныя вочы, [continued] та і горача.

Так, напрыклад, калі прафесар Эк выклікаў яго на рэлігійныя спрэчкі, Лютэр стойка вытрымаў Экавы нападкі і абараняўся, як леў. Выслухаўшы думку Лютэра аб Іягане Гусе, Эк сказаў:

— З гэтых часоў, высокашаноўны айцец, будзьце Вы мне як паганец і мытар.

— Сам ты добры!— адказаў яму Лютэр (Шлезинг. II ч. С. 143), чым гэты гістарычны дыспут і скончыўся.

**Аб адным прыёме Напалёна,** да якога ён звяртаўся і які прывязваў салдат да палкаводца непарыўнымі ланцугамі. Халодная, туманная раніца... Салдаты туляцца да вогнішчаў, змрочныя, у чаканні бітвы. Напалён выходзіць з палаткі і адклікае ад вогнішча аднаго салдата.

— Э... паслухай, братка!.. Як клічуць таго салдата з вусамі, якому ты даваў прыкурыць і які так весела смяецца?

— Гэты? Жан Дзюпон з Брэтані. Ён учора ліст атрымаў ад хворай маці, якая ўжо выздараўлівае, і таму зараз рады, як цяля.

Напалён накіроўваецца да гэтага салдата:

— Здарова, Жан Дзюпон!

Дзюпон "расцвітае". Імператар ведае яго прозвішча! Імператар яго памятае!..

— А што, Жан Дзюпон, прыгожая краіна ваша Брэтань?!

Дзюпон ледзь на нагах стаіць ад шчасця. Імператар Францыі нават ведае, адкуль ён!

— Ну, як тваёй маці — лепей цяпер? Выздараўлівае?

Калі бедны салдат не вар'яцее ад здзіўлення і захаплення, ён падае перад цудоўным валадаром на калені, цалуе рукі і потым спрабуе ўцячы з пэўнай мэтай раззваніць таварышам аб усім, што адбылося. Але Напалён утрымлівае яго.

— Скажы, ад каго ты зараз закурваў папяросу? Такі руды...

— А! Гэты? Мой таварыш, парыжанін Клод Патафэ. Сірата. Бацьку яго забілі ў час узяцця Бастыліі, і ў яго цяпер, апрача нявесты, маленькай Жанны, нікога няма ў Парыжы.

Гадзіны праз дзве Напалён натыкаецца на Клода Патафэ.

— Здарова, стары таварыш Клод Патафэ! Пэўна, сам тут — хе-хе!— а думкі ў Парыжы, каля маленькай Жанны. Эх ты, шэльма!!! Ну, паглядзім, ці такі ж ты задзіра ў бітве, як твой бацька, які скруціў сваю старую шыю каля Бастыліі 14 ліпеня.

Клод Патафэ траціць ад здзіўлення прытомнасць, а калі прыходзіць у сябе, кажа сваім таварышам:

— Вось гэта палкаводзец! Нас у яго 200 тысяч, а ён ведае і памятае жыццё кожнага салдата, як сваё ўласнае.

***Падрыхтавала Паліна Грушына***

## Международная Соросовская Программа образования в области точных наук в Беларуси объявляет конкурс по подпрограмме "Соросовские студенты-стипендиаты"

Целью настоящей подпрограммы является поддержка лучших студентов высших учебных заведений Беларуси очного обучения, которые специализируются в области физики, математики, химии, биологии и наук о Земле. Отбор кандидатов на получение Соросовской стипендии будет проведен на основании конкурса, для участия в котором необходимо наличие, по крайней мере, одного из следующих показателей:

***1. Победа в областных, республиканских, международных или Соросовских олимпиадах школьников (прилагаются копии дипломов победителей).***

***2. Публикация научных статей в отечественных или зарубежных журналах (прилагаются оттиски публикаций, справки из редакций о принятии статей к печати).***

***3. Участие с докладами, сообщениями или лекциями в национальных или международных симпозиумах, совещаниях, конгрессах и конференциях (прилагаются тезисы докладов и сообщений, программы конференций и др.).***

***4. Участие в качестве соисполнителя в исследовательских грантах как отечественных, так и зарубежных (прилагаются справки администрации о включении студента в коллектив исследователей).***

***5. Участие в реализованных авторских предложениях или изобретениях (прилагаются подтверждающие документы).***

***6. Наличие не более 5% оценок "хорошо" и остальных "отлично" за три последовательных года обучения в вузе.***

**Каждый, обращающийся за получением Соросовской стипендии должен представить документальное подтверждение выполнения одного, нескольких или всех приведенных выше условий. Победители будут определены по совокупности этих показателей. При прочих равных условиях будут приняты во внимание рекомендации Соросовских профессоров и Соросовских доцентов (каждый профессор или доцент может рекомендовать несколько студентов).**

При подаче документов необходимо представить заявление, документальное подтверждение своих достижений, **выписку из зачетной книжки (включая летнюю сессию), заверенную в деканате,** конверт с надписанным домашним адресом или адресом для переписки и наклеенными марками. В заявлении необходимо дать краткие сведения о себе (фамилия, имя, отчество, год рождения, место учебы, факультет, курс, специальность, паспортные данные, круг интересов, домашний адрес и адрес для переписки, домашний телефон или телефон, по которому можно быстро передать информацию). Просим не присылать оригиналы документов, заверять копии у нотариуса не обязательно. Участие в конкурсе только по первому пункту обязательных условий допускается исключительно для студентов 1-го и 2-го курсов. Любые документальные подтверждения творческой активности кандидата будут приняты во внимание.

Соросовским студентам — получателям грантов в 1994/1995 и 1995/1996 учебных годах, желающим участвовать в настоящем конкурсе, необходимо продублировать присланные ранее документы и отдельно представить документальное подтверждение выполнения условий конкурса за период получения Соросовской стипендии и последующий период.

Документы, не соответствующие всем предъявленным требованиям, рассматриваться не будут. Поданные на конкурс материалы не возвращаются.

Соросовская стипендия будет выплачиваться на протяжении учебного года (10 месяцев) в дополнение к обычной стипендии, назначаемой студентам руководством вузов.

**Грант присуждается исключительно для поддержки научной деятельности и учебы.**

Заявки на участие в конкурсе "Соросовский студент-стипендиат" должны быть отправлены не познее 15 июля 1996 г. **только почтой** по адресу: **220072 Минск-72, пр. Ф.Скорины 66, Международная Соросовская Программа образования в области точных наук.** Документы от студентов 1 курса, поступивших в вузы в 1996 г., принимаются до 1 октября 1996 г. Имена Соросовских стипендиатов будут объявлены до 1 ноября 1996 г., выплата стипендий осуществляется ретроспективно с начала осеннего семестра 1996/1997 учебного года. Контактный телефон: (0172) 68-57-45.

*Сённяшні дзень, здаецца, дае мала падставаў для лірыкі і фантазіяў. Людзі болей думаюць пра надзённае. Але не заўсёды, на шчасце, будзённасць забівае ў чалавеку прагу да прыгожага. У маладосці гэта і ўвогуле працей. Памяць захоўвае дзіцячыя ўражанні — магчыма, наіўныя, магчыма, даволі нерэальныя...Але такія прыцягальныя. Прыкладам могуць быць і апавяданні* Крысціны Курчанковай. *Адно з іх я й прапаноўваю чытачам "Беларускага ўніверсітэта".*

*Вучыцца дзяўчынка ў СШ № 19 г.Мінска. Свае творы яна ўжо друкавала ў перыядычных выданнях Беларусі. Апроч гэтага, Крысціна марыць паступіць на факультэт журналістыкі БДУ.*

*Уладзімір Пучынскі-Піраг, рэдактар аддзела газеты "Дзеці і мы"*

## Асколкі

На прыступках доўгай, можа быць бясконцай, лесвіцы сядзеў хлопчык і круціў у руках шкляны шарык загадкавага жоўта-зялёнага колеру. Такія шарыкі бываюць у кожнага ў дзяцінстве: шкляныя, празрыстыя, з кропелькай паветра, быццам запячатанай усярэдзіне.

Раптам шарык выслізнуў з доўгіх, пыльных пальцаў і ўпаў. Ён пракаціўся па аднае прыступцы, звонка ўдарыўся аб наступную, зноў на імгненне апынуўся ў паветры...а потым пабіўся.

Асколкі паляцелі ва ўсе бакі, яны заззялі пад праменнямі шчодрага летняга сонца, адбіўшы нешта на сваёй няроўнай паверхні — скаверканае і пераламанае.

I

Мужчына зрабіў крок і трапіў у лабірынт са сценамі, складзенымі з мноства люстэркаў рознай формы і велічыні. І — дзіўна! — кожнае шкло адбівала толькі вока, толькі адно вока. Такой жа велічыні, як і само люстра. Вочы былі розныя, сярод іх не было двух аднолькавых. Паводзілі яны сябе па-рознаму. Яны былі розных колераў, міргалі, жмурыліся, сарамліва падымалі вейкі, плакалі...

Мужчына зрабіў крок, і вочы зніклі. Тольк ягоная постаць адбівалася ва ўсіх люстэрках. Чалавек зрабіў крок.

II

Гэта была вялікая (нават вельмі вялікая) лужына. Яна залівала большую палову тратуара і частку дарогі.

Прахожыя злосна лаяліся, абыходзячы лужыну, а яшчэ болей калі машына кпліва абдавала іх бруднай вадою. З лужыны пілі галубы, а дзеці доўга ў ёй плёскаліся пад незадаволеныя воклічы бацькоў.

Але ніхто не заўважаў, што ў бруднай вадзе адбіваліся купалы храма; і адзінокая зорка падміргвала залачонаму крыжу, адкуль задуменны Хрыстос глядзеў на смешнаватую і дурнаватую зямлю...

III

— Вось я прыйшоў. Ці пазнала ты мяне?— запытаўся Грэй.

Асоль згодна хітнула галавою. Шчасце сядзела ў ёй калматым кацянём.

— Зусім такі!— сказала сівая Асоль.

— Хадзем! — паклікаў Грэй.

— Я чакала цябе,— сказала Асоль.

І памерла.

IV

...ружа пакахала скрыпку...

V

Тры кошкі сядзелі ў крыштальным кубе. Іх вочы гіпнатызавалі быццам язычкі полымя. Былі яны пацеркамі з чорнымі ніцямі, пацеркамі каштоўнымі і жывымі. Кошкі сядзелі і не варушыліся; замерлі іх чуйныя вушы, задрамалі лескі-вусікі.

Толькі вочы былі жывыя.

У адной коткі яны былі ізумрудна-зялёныя.

У другой — чыста сінія.

Вочы ж трэцяй — кавалачкі бурштыну. Нібы зачараваныя, сядзелі коткі ў гранёным крыштальным кубе, глядзячы адна адной у вочы.

За мяжою іх абмежаванага сусвету ствараліся й разбураліся галактыкі, жыццё імчала метэарытным патокам.

Які крохкі крыштальны куб!

Толькі коткі сядзелі ў немым захапленні, баючыся ўздыхнуць, каб не спужаць суседку, баючыся міргнуць, не ў сілах адвесці пагляду. Тры коткі ў крыштальным кубе.

VI

Плакалі вокны трамвая.

Вечар і туман, у абдымку, ішлі па горадзе. Святло ад ліхтароў расплывалася ў няправільныя авалы. Якія танулі ў брудна-шэрай смузе восені.

Дажджу не было.

Здавалася, кроплі вільгаці проста віселі ў паветры.

— У такі вечар проста згубіцца,— сказала Яна.

Плакалі вокны трамвая.

У гэты момант міма пранёсся яшчэ адзін... Два трамваі зліліся на нейкае імгненне. І раптам жанчына адчула той, знікаючы ў вечары трамвай, яна зразумела, разабрала, аддзяліла кожны ўздых у ім.

Трамвай знік у тумане, плакалі вокны.

Яна азірнулася. На сядзенні побач нікога не было.

VII

Прыступкі лесвіцы ў восеньскім парку, на ліхтарнае тумбе сядзіць нейкі п'яны студэнт у позе паэта.

У гэтае імгненне даруюцца ўсе ягоныя грахі і гэты п'яны стан. Бо ў гэтае імгненне, аб якім ён, вядома ж, забудзецца, калі працверазее, у гэты момант, калі аранжавая туманнасць ліхтара тоне ў восеньскім змроку, у гэтае імгненне, якое ляціць і звініць чатырма тысячамі друдаўскіх грынаўскіх бубеньчыкаў (можа, болей, можа, і меней), у гэтае спеўнае імгненне ЁН БЫЎ ПАЭТАМ.

*Аркадзь Нафрановіч, чые вершы прапануюцца чытачам,— выпускнік геаграфічнага факультэта БДУ 1968 года.*

*Многіх славутых паэтаў і празаікаў выпусціў Белдзяржуніверсітэт. Яшчэ больш сярод ягоных выпускнікоў — малавядомых. Але хіба для таго, хто прэтэндуе на імя Паэта, можа мець нейкае значэнне папулярнасць або яе адсутнасць?..*

*Шмат якія з вершаў Аркадзя Нафрановіча сталі песнямі, прычым музыку да іх пісаў Мікалай Пятрэнка — аўтар мелодыі славутых "Ручнікоў".*

Думкі застаяліся, як коні,
Стойла — прэч, няхай жыве прастор!
Не рыхтуйце хамуты, супоні,
Не спрабуйце асядлаць віхор.

Тым, хто ўжо без цугляў і аброці,
Не ўказаць напрамак лейчынай.
Хуткасць, націск — свет стары калоціць
Ад грымот свабоды маладой.

● ● ●

***Сыну Валерыю***

Час хуткаплынны — трыццаць чатыры,
Меркай сусвету — здзіўлення міг.
Пішацца вобраз плённа і шчыра,
Дзень — і яшчэ да партрэта штрых.

Як светлацені, ява і мроі,
Лодку хістае — за крэнам крэн.
І неаднойчы падалі Троі,
Рым лікаваў, гарэў Карфаген.

Тайнаў разгадка — трыццаць чатыры,
Безліч набыткаў і горыч страт.
Бог ажывае, гінуць куміры,
Строгі каштоўнасцей перагляд.

Рух ад падножжа да перавалу,
Зрывы, пад'ёмы — строма-гара.
...Так непрыкметна прыходзіць сталасць —
Хрыстом нязведаная пара.

● ● ●

***Сон і ява***

Вусамі я і барадой аброс,
Зямлю пакінуў і над ёй лятаю.
І падалося: я амаль Хрыстос,
І ў мяне, як ёсць, душа святая.

Чамусь суседка Маня ля мяне.
О, незаганная мая жанчынка:
То рыбкаю пад грудзі мне нырне,
То злева, справа кружыць аблачынкай.

Як хораша пад сонейкам лунаць
І ўзлятаць пушынкамі да зорак.
Не верыцца, што ёй за трыццаць пяць,
І я пераваліў даўно за сорак.

Прачнуўся...
Жончын прада мной фартух,
Кіпіць уся, бы ў непагоду мора.
— Ну, раскажы, бадзялы ты пятух,
З якой курыцай знюхаўся ўчора?
І пачала "выхоўваць" зноў з хваста,
Да грэбеня дабрацца хоча, чую.
І енчу:
— Хіба ж можна так Хрыста?
Валтузіць так душу яго святую?

● ● ●

***І што з таго***

Ну што з таго, што Пётр Лукін
Цыбулькай Петрусём назваўся:
Быў перш ён проста сукін сын,
Цяпер сабачым сынам стаўся.

## Афіцыйна

— Такім чынам, вада, якую вы маеце, забруджаная. Якія меры перасцярогі вы прадпрымаеце?

— Спачатку мы яе фільтруем, потым кіпяцім, потым дадаем хімікаліі.

— Цудоўна. А потым?

— Потым мы п'ем піва.

● ● ●

Студэнт радасна выскоквае з-за стала і бяжыць да дзвярэй з крыкам "Здаў!"

— Пастойце!— крычыць прафесар і паказвае на залікоўку: — Трэба ж адзначыць!

— Увечары адзначым!— даносіцца з-за дзвярэй вокліч лікавання.

● ● ●

Амерыканскі фізік Эвершмен падвёў баланс жыцця сучаснага вучонага да 60-ці гадоў. Дзяцінства і вучоба — 24 гады, сон — 20 гадоў, адпачынак, выхадныя — 12 гадоў, харчаванне — 2,5 гады, іншыя патрэбы — 1,25 года. Такім чынам, атрымалася лічба 59,75 года. І толькі той час, што застаўся — 0,25 года, г.зн. 90 дзён за ўсё 60-гадовае жыццё вучоны аддае навуцы.

Перапісванне з адной кнігі — плагіят. Перапісванне з дзвюх кніг — кампіляцыя. Перапісванне з трох кніг — доктарская дысертацыя. Перапісванне з чатырох кніг — пятая навуковая кніга.

● ● ●

Аднойчы ў кабінет акадэміка М.М.Бекетава забег усхваляваны слуга і закрычаў:

— Мікалай Мікалаевіч, у вашай бібліятэцы злодзеі!

Навуковец адарваўся ад разлікаў і спакойна спытаў:

— І што ж яны чытаюць?

● ● ●

Адзін вельмі надакучлівы аспірант давёў свайго кіраўніка да таго, што той сказаў яму: "Ідзіце і распрацуйце пабудову правільнага многавугольніка з 655537 бакамі". Аспірант пайшоў, каб вярнуцца праз 20 гадоў з адпаведнай пабудовай.

● ● ●

Чым далей эксперымент ад тэорыі, тым бліжэй ён да Нобелеўскай прэміі.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

*Газета падпісана у друк у 12.00.*

*28 сакавіка Зак. 2004. Т. 1000 экз.*



*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакої 411-412, тэлефон 206827.*



**В.а. рэдактара Т.М. Казак**